# Выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь дваццаць сёмага склікання

## Справаздача па выніках назірання за фарміраваннем акруговых выбарчых камісій

*Назіранне ажыццяўляецца актывістамі РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт» і ПЦ «Вясна» ў межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары»*[1]
*У назіранні ўдзельнічаюць 29 доўгатэрміновых назіральнікаў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары»*

## АГУЛЬНЫЯ ВЫСНОВЫ

Акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў (*далей* – АВК) з'яўляюцца важным суб'ектам выбарчага працэсу. Да паўнамоцтваў АВК аднесены, у прыватнасці, арганізацыя правядзення выбараў, кіраўніцтва дзейнасцю ўчастковых выбарчых камісій, рэгістрацыя ініцыятыўных груп грамадзян па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку асоб, прапанаваных для вылучэння кандыдатамі ў дэпутаты, і правядзенне агітацыі за іх абранне, рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты і іх давераных асоб, кантроль складання спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, разгляд заяў і скаргаў на рашэнні і дзеянні ўчастковых выбарчых камісій.

Выбарчае заканадаўства не забяспечвае празрыстасці працэсу фарміравання АВК. У 43% выпадкаў прадстаўнікам кампаніі «Правабаронцы за свабодныя выбары» было адмоўлена ў праве прысутнічаць з мэтай маніторынгу на пасяджэннях органаў, якія фарміравалі АВК.

Інфармацыя пра месца і час пасяджэння органаў, якія фарміруюць АВК, падавалася абмежавана. Зафіксаваны выпадкі адмовы ў прадастаўленні гэтай інфармацыі назіральнікам кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».

Адсутнасць заканадаўча замацаваных крытэрыяў уключэння грамадзян у АВК, прыводзіць да фармальнага і адвольнага вызначэння іх складу адпаведнымі органамі, а таксама робіць неэфектыўным абскарджанне ў судзе адмовы ва ўключэнні ў выбарчыя камісіі.

Прынясце рашэнняў аб складзе АВК у пераважнай большасці выпадкаў адбывалася шляхам спісачнага галасавання, без адкрытага абмеркавання вылучаных кандыдатур.

Нягледзячы на высокую актыўнасць апазіцыйных палітычных партый па вылучэнні сваіх прадстаўнікоў (185 чалавек ці 36,7 % ад усіх вылучэнцаў палітычных партый), у склад АВК з іх увайшло толькі 11 чалавек (5,95 % ад вылучаных). Доля прадстаўнікоў апазіцыйных партый у складзе створаных камісій склала 0,25 %(ад членаў АВК).

---

[1] РПГА «Беларускі Хельсінкскі Камітэт»: http://belhelcom.org/docs; ПЦ «Вясна»: http://spring96.org/.

Вынікі фарміравання АВК сведчаць аб відавочна дыскрымінацыйных падыходах. Для параўнання: падчас парламенцкіх выбараў 2008 г. у склад АВК было ўключана 32% ад вылучаных апазіцыйнымі партыямі, у 2012 г. – 24%.

## ПРАВАВАЯ БАЗА

У адпаведнасці з арт. 29 ВК падрыхтоўку і правядзенне выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў забяспечваюць АВК і ТВК, якія ажыцяўляюць у раёнах г. Мінска паўнамоцтвы АВК па выбарах дэпутатаў у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў (у кожным раёне г. Мінска ствараецца па адной камісіі).

Згодна з арт. 34 ВК акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў абласных Саветаў дэпутатаў, тэрытарыяльны выбарчыя камісіі, якія ажыцяўляюць у раёнах г. Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў фарміруюцца прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласнымі, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтамі з прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб’яднанняў, працоўных калектываў, а таксама прадстаўнікоў грамадзянаў, вылучаных у склад камісіі шляхам падачы заявы. АВК фарміруюцца ў складзе 9–13 сяброў не пазней за 75 дзён да выбараў.

Парадак вылучэння прадстаўнікоў у склад АВК рэгулюецца арт. 35 ВК. Вылучаць у склад АВК па адным прадстаўніку маюць права: кіруючыя органы абласных і Мінскіх гарадскіх арганізацыйных структур палітычных партый, іншых грамадскіх аб’яднанняў; сход працоўнага калектыву арганізацыі ці працоўныя калектывы іх структурных падраздзяленняў (пры колькасці працоўных не меньш за 10 чалавек), якія знаходзяцца на тэрыторыі адпаведнай выбарчай акругі; выбаршчыкі ў колькасці не менш за 10 чалавек, якія пражываюць на тэрыторыі адпаведнай выбарчай акругі ці раёна у г. Мінске і якія вылодаюць выбарчым правам.

Згодна з ч. 6 арт. 34 ВК, не менш за трацiну сяброў камісіі павінны складаць прадстаўнікі палітычных партый і іншых грамадскіх аб’яднанняў. У склад камісій не могуць уваходзіць суддзі, пракуроры, кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Дзяржаўныя служачыя не павінны складаць больш за трацiну складу камісіі.

На пасяджэнні органаў, якія фарміруюць камісіі, маюць права прысутнічаць прадстаўнікі палітычных партый, іншых грамадскіх аб’яднанняў, працоўных калектываў, грамадзян, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісій. Рашэнне органаў, якія ўтварылі камісіі, можа быць абскарджана ў судовым парадку у трохдзённы тэрмін з дня прыняцця. Суд разглядае скаргу ў трохдзённы тэрмін, яго рашэнне з’яўлецца канчатковым.

## ПРАЦЭС ВЫЛУЧЭННЯ Ў СКЛАД АВК

Згодна з Каляндарным планам[2] вылучэнне прадстаўнікоў у склад АВК і прадастаўленне ў органы, якія іх фарміруюць, адпаведных дакументаў адбылося не пазней за 3 студзеня 2014 г. уключна.

---

[2] КАЛЕНДАРНЫЙ ПЛАН организационных мероприятий по подготовке и проведению выборов в местные Советы депутатов Республики Беларусь двадцать седьмого созыва.

У склад  364 АВК было вылучана 5438 чалавекі. Сярод іх ад грамадзянаў шляхам падачы заявы – 1950 чалавек (35,9%), ад працоўных калектываў – 650 чалавек (12%), ад грамадскіх арганізацый і аб’яднанняў – 2838 чалавек (52,2%), ад палітычных партый – 504 чалавек (9,3%).




Апазіцыйныя партыі прынялі актыўны ўдзел у вылучэнні сваіх прадстаўнікоў у АВК. Беларуская партыя левых «Справядлівы свет»  вылучыла 97 чалавек, Партыя БНФ – 44, АГП – 36, БСДП (Г) – 8. Такім  чынам, усяго апазіцыйныя палітычныя партыі вылучылі 185 чалавек, што склала 3,4 % ад агульнай колькасці і 36,7 % ад прадстаўнікоў палітычных партый. Для параўнання: падчас выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў 2012 г. апазіцыйныя партыі вылучалі 199 чалавек, што склала 49,75 % ад усіх прадстаўнікоў палітычных партый, а ў 2008 г. апазіцыйныя партыі вылучалі 118 чалавек, што склала 31,9 % ад вылучаных палітычнымі партыямі.

Вялікую актыўнасць праявілі праўладныя грамадскія аб’яднанні: Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі – 893 прадстаўнікі (16,4%), Беларускае грамадскае аб’яднанне ветэранаў – 267 (4,9%), БРСМ – 305 (5,6%), РГА «Белая Русь» – 346 (6,4%). Гэтыя чатыры грамадскія аб’яднанні вылучылі 33,3 % ад агульнай колькасці прэтэндэнтаў у склад АВК і  77,6 % ад вылучаных грамадскімі  і іншымі аб’яднаннямі.




**ПАСЯДЖЭННІ ОРГАНАЎ, ЯКІЯ ЎТВАРАЮЦЬ КАМІСІІ**

Згодна з Каляндарным планам пасяджэнні прэзідыумаў абласных, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і абласных, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта адбыліся да 6 студзеня 2014 г.

Дзяржаўныя СМІ і Інтэрнэт-рэсурсы практычна не давалі інфармацыю пра час і месца пасяджэнняў. Прадстаўнікі суб'ектаў, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у АВК, даведваліся пра гэта непасрэдна ад прадстаўнікоў органаў выканаўчай улады. Зафіксаваны выпадкі адмовы ў прадастаўленні гэтай інфармацыі назіральнікам кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары». У Магілёве прадстаўніку РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт» Уладзіміру Краўчанку не далі патрэбных звестак ні па тэлефоне, ні пры асабістай сустрэчы.

Пасяджэнне прэзідыума Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў і абласнога выканаўчага камітэта працягвалася каля 30 хвілін. Падчас яго кандыдатуры не абмяркоўваліся і не прадстаўляліся, галасаванне па зацвярджэнні складу АВК адбывалася спісам. На пасяджэнні выступалі толькі страшыня аблвыканкаму Пётр Руднік і старшыня Упраўлення арганізацыйна-кадравай работы Аляксандр Сіваеў. Прысутным забаранялася задаваць пытанні. Спосаб вылучэння і месца працы ўключаных у склад АВК не паведамляліся. Былі зачытаны спісы кандыдатаў. Зацікаўленым асобам не далі магчымасці азнаёміцца з дакументамі па вылучэнні ў склад АВК. Аналагічны характар мела пасяджэнне прэзідыума Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў і абласнога выканаўчага камітэта. Апазіцыйныя партыі прадстаўляў толькі вылучэнец ад Партыі БНФ, але ён быў уключаны ў склад камісіі.

На пасяджэнні прэзідыума Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў і абласнога выканаўчага камітэта ў склад АВК не ўключылі ні аднаго з 54 прадстаўнікоў апазіцыйных партый. Прычынай адмовы называлася адсутнасць досведу працы ў камісіях.
Прэзідыумы Мінскага абласнога і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і адпаведныя выканаўчыя камітэты правялі пасяджэнні за 12 і 25 хвілін адпаведна. Дыскрымінацыйны

характар мела рашэнне адносна АВК горада Мінска: з 35 вылучаных прадстаўнікоў апазіцыйных суб'ектаў у склад АВК не ўключаны ні адзін.

Адзначаецца закрыты характар працэдуры фарміравання АВК. Назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» змаглі прысутнічаць толькі на 4 з 7 пасяджэнняў органаў, якія прымалі рашэнні адносна персанальнага складу АВК. Адмовы ў магчымасці назіраць за гэтым працэсам былі ў 43% выпадкаў.

## СКЛАД АВК

Згодна з дадзенымі Цэнтральнай камісіі[3] сябрамі АВК сталі 4 393 чалавек. Прадстаўніцтва апазіцыйных партый у складзе ўтвораных АВК – 11 чалавек (0,25% ад агульнай колькасці сяброў камісій і 5,95% ад вылучаных апазіцыйнымі партыямі). Для параўнання: прадстаўніцтва апазіцыйных партый у складзе АВК падчас парламенцкіх выбараў 2012 г. склала 48 чалавек (3,3% ад агульнай колькасці сяброў камісій і 24% ад вылучаных апазіцыйнымі партыямі). Падчас парламенцкіх выбараў 2008 г. колькасць вылучаных апазіцыйнмі партыямі ў АВК складала 118 чалавек. У склад камісій увайшло 38 чалавек (2,2 % ад агульнай колькасці сяброў АВК і 32% ад вылучаных апазіцыйнамі партыямі). Такім чынам, у параўнанні з 2008 і 2012 гг. адзначаецца змяншэнне прадстаўнікоў апазіцыйных партый у складзе АВК.




Ад праўладных партый у склад АВК уключаны 222 прадстаўнікі (69,6 % ад вылучаных).
Як і падчас папярэдніх выбарчых кампаній, асноўнымі арганізацыямі, прадстаўленымі ў складзе АВК, сталі Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», РГА «Белая Русь» і Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў. Ад РГА «Белая Русь» увайшло 334 прадстаўнікі (7,6 % ад агульнай колькасці сяброў камісій), ад ФПБ – 791 прадстаўнік (18 % ад агульнай колькасці сяброў АВК), ад БРСМ – 273 прадстаўнікі (6,2 % ад агульнай колькасці сяброў АВК), ад Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў – 245 прадстаўнікоў (5,6% ад агульнай колькасці сяброў АВК). Пры тым, што колькасць сяброў апазіцыйных партый у складзе АВК у параўнанні з парламенцкімі выбарамі 2008 і 2012 гг. значна зменшылася, працэнт "праходнасці" прадстаўнікоў праўладных актывістаў стаў значна вышэйшым (ад РГА «Белая Русь» у склад АВК уключана 96,5 %).

[3] Даступна на: http://www.rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-MS27-sved5.pdf.